тыўную і следчую работу. У выніку антысавецкаму падполлю быў нанесены адчувальны ўдар у 1944 і 1947 гг., а ў 1953 г. яно было поўнасцю знішчана.

Такім чынам, можна рэзюмаваць, што мясцовыя органы кіравання Свіслацкага раёна сваёй дзейнасцю садзейнічалі ўмацаванню беларускай савецкай дзяржаўнасці, вырашалі справы аднаўлення разбуранай вайною эканомікі, а жыхары раёна ў большасці сваёй даволі актыўна ўдзельнічалі ў аднаўленні мірнага жыцця ў першыя паслеваенныя гады, што дазволіла ў кароткі тэрмін залячыць ваенныя раны.

---

*1.* Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. : у 2 кн. / рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.] ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск : Беларус. Навука, 2012. – Кн. 2. – 654 с.

*2.* Нарысы гісторыі Беларусі : у 2 ч. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 1994–1995. – Ч. 2. – 1995. – 560 с.

*3.* Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ). – Ф. 1377. Оп. 1. Д. 1. Л. 12–22.

*4.* Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ). – Ф. 7. Оп. 3. Д. 1771.

*5.* Памяць : Свіслацкі р-н : гіст.-дак. хронікі гарадоў і р-наў Беларусі / рэдкал. І. І. Варанец [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 2004. – 526 с.

Т. Ф. СУХОЦКАЯ

## АСВЕТНІЦКАЯ СКІРАВАНАСЦЬ ТВОРЧАЙ СПАДЧЫНЫ СТАРОГА УЛАСА

Вялікая роля ў стварэнні беларускай культурнай прасторы належыць знакамітым родам ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Многія з іх актыўна займаліся мецэнацкай дзейнасцю. Дзякуючы іх падтрымцы духоўная спадчына беларускага народа ўзбагацілася многімі выдатнымі асобамі, творчы патэнцыял якіх змог раскрыцца і рэалізавацца. Матэрыяльная і маральная дапамога графа Міхала Тышкевіча паспрыяла з’яўленню на небасхіле нацыянальнай культуры зоркі таленавітага беларускага збіральніка фальклору, паэта, публіцыста Уладзіслава Пятровіча Сівы-Сівіцкага (Старога Уласа).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Нарадзіўся будучы творца 10 (23) сакавіка 1865 г. у сям'і валожынскіх сялян Пятра і Людвікі. Бацька быў малазямельны. Каб выжыць і гадаваць дзяцей ён наняўся кухарам у маёнтак графа Міхала Тышкевіча, да роду якога ў 1803 г. перайшоў Валожын. У дзевяць гадоў Уладзіслаў застаўся круглым сіратой, і цётка Юзэфа Емільянская дала прытулак пляменніку. Аднак хутка хлопчык трапляе ў графскі палац у навучанне да кухара. А ў трыццаць гадоў Сівы-Сівіцкі займае ўжо пасаду аб'ездчыка, а потым – ляснічага. Такі «кар'ерны» рост сіраты ў тагачасных сацыяльных умовах сведчыць найперш пра яго асабістыя здольнасці. У 1934 г. за больш чым саракагадовую службу ў графа Тышкевіча Уладзіслаў атрымаў кавалак зямлі, дзе гаспадарыў да канца свайго жыцця. 30 верасня 1939 г. ён памірае ад запалення лёгкіх. Пахаваны на Сужанскіх могілках.

Галоўнай мэтай свайго жыцця Уладзіслаў Сівы-Сівіцкі бачыў навуку, самаадукацыю. Самастойна навучыўся грамаце (рускай і польскай), пісаў прыгожым каліграфічным почыркам. Пісьменніцкую дзейнасць пачынае з вершаў, напісаных у гонар сваёй нявесты Антаніны Вайцяхоўскай, шлюб з якой благаславіў сам граф Міхал Тышкевіч. Пазней адбываецца знаёмства з газетамі «Наша доля», «Наша ніва», на старонках якіх былі надрукаваны яго шматлікія творы: вершы, вершаваныя апавяданні, публіцыстыка. Так з'яўляецца беларускі паэт-самавучка Стары Улас.

Для асобы песняра ўласціва высокая ступень нацыянальнай і культурнай ідэнтычнасці. Ён добра разумеў розніцу паміж нацыянальнасцю і веравызнаннем, таму ў пашпарце Уладзіслава Пятровіча Сівы-Сівіцкага ўказваецца, што ён па нацыянальнасці беларусін і належыт да рымска-каталіцкай рэлігіі. Жонка паэта лічыла сябе полькай і хаця была вельмі адметнай жанчынай, з шырокім колам інтарэсаў, але беларускамоўнасць мужа лічыла дзівацтвам. Неадназначна ўспрымалі пана ляснічага і простыя людзі таму, што размаўляў з імі на іх роднай мове. «…Сяляне паважалі высокага, прыгожага, з вусамі і невялікай – клінам – бародкай ляснічага, які паводзіў сябе з імі як з роўнымі, спачуваў ім, дапамагаў лесам, заступаўся за іх, калі трэба было, перад самім графам» [1, с. 6].

На развіццё сацыяльна-палітычных поглядаў Старога Уласа значны ўплыў зрабілі газеты «Наша доля» і «Наша ніва», дапа-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

маглі спасцігнуць сэнс адраджэнскіх працэсаў, скіраваць мастацкую інтуіцыю на раскрыццё «адвечных праблем» простага люду: беднаты, голада, сацыяльнай несправядлівасці, неадукаванасці, п’янства, разбою і г. д. Уздымае паэт і праблему захавання гістарычнай і культурнай памяці, якую звязваў з разбурэннем аднаго з вызначальных у беларускай культуры культа продкаў. У допісах у «Нашу ніву» Сівы-Савіцкі вучыў сялян па-новаму глядзець на ўладкаванне свайго жыцця.

Асоба Старога Уласа фарміравалася і ў кантэксце каштоўнасных сэнсаў беларускай народнай культуры. Адзін з фактараў крышталізацыі індывідуальнага стылю паэта – моцнае ўздзеянне фальклорнай аксіялогіі, жывой народнай традыцыі. Мастацкая апрацоўка народных песень і паданняў, актыўнае выкарыстанне беларускіх сюжэтаў, вобразаў традыцыйнай эстэтычнай сістэмы стала адметнасцю яго творчасці. Апавядальнасць, падзейнасць вершаваных твораў Старога Уласа з’яўляюцца агранічым працягам гутарковай плыні ў беларускай літаратуры XIX стагоддзя («Вясна», «Восень», «Пажар», «Сватаўство» і інш.). Яго паэтычныя творы вызначаюцца эпічнасцю, у меншай ступені ў іх праяўляецца лірычны пачатак.

Вялікую ролю ў культуратворчасці народа і асобы Стары Улас надаваў слову:

Слоўца адно, а часам другое,
Сказана мудра, у пору,
Душу асвежыць, мысль заспакоіць,
Як бы адверне з плеч гору [1, с. 20].

Важнейшым фактарам ідэнтыфікацыі асобы паэт лічыў мову. Беларуская мова была для яго сродкам зносін і самавыяўлення.

Культурна-асветніцкая дзейнасць Старога Уласа была скіравана на пераадоленне сацыяльнага зла праз адукацыю, творчасць. Дбаючы пра будучае пакаленне, ён уласнымі высілкамі адкрывае школу для дзяцей у сваім доме. Запрашае настаўніцу, якая выкладала на роднай мове. Сямейнай традыцыяй становіцца чытанне. Паэтам была сабрана неблагая хатняя бібліятэка, якой карысталіся суседзі, знаёмыя. Такім чынам, адбываецца рэалізацыя прынцыпа культуразгоднасці ў вучэбным працэсе, які скіраваны найперш на выхаванне асобы ў сілавым полі нацыянальнай культуры. На жаль, навучанне хутка было пера-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ведзена на польскую мову з прычыны недазволу на гэта афіцыйных улад.

Беларуская адраджэнская культура ў цэнтр грамадскага і культурнага жыццядзеяння паставіла сялянскае асяроддзе як крыніцы нацыянальнай самабытнасці, таму галоўнымі героямі ў творах Старога Уласа былі селянін і родная прырода. У паэме «Год беларуса» панарама каляндарнага цыкла земляроба раскрываецца праз стварэнне топасу «поры года». Замілаванне хараством роднай прыроды і ноткі жальбы гарманічна паяднаны ў творы, ствараюць адчуванне бесперапыннай працы селяніна. Паэма Старога Уласа тыпалагічна блізкая да «Чатырох пораў года» літоўскага паэта Крысціёнаса Данелайціса, да медзярытаў выдатнага беларускага графіка XVII ст. Аляксандра Тарасевіча, напісаных да кнігі «Rosarium…».

Актуалізуецца ў творах Старога Уласа і праблема менталітэту беларусаў. Яго адметнасцю паэт лічыць нізкі ўзровень грамадзянскай актыўнасці і адказнасці, нявер’е ў навуку, дабрадушнасць, ціхмянасць, нясмеласць. У вершы «Нябожчык» з горыччу асуджае адвечнае цярпенне беларуса праз давядзенне да абсурду сітуацыі з чаргой на пахаванне.

Паэт добра разумеў прычыны сацыяльнага зла і несправядлівасці. Даў яркія сатырычныя замалёўкі паноў і шляхты, высмейвае іх моду і лад жыцця, бессэнсоўнасць раскошы, абураецца за здзеклівыя адносіны да сялян і іх роднай мовы («Мода», «Пра паноў», «У касцёле»). І як заклінанне гучаць радкі:

Выбаў жа, Божа, нашу зямельку
Із-пад няволі – выбаў із пут! [1, с. 55].

Погляды Старога Уласа скіраваны на згоду і справядлівасць у грамадстве праз прымірэнне паноў з сялянамі. Паэту не ўласцівы рэвалюцыйныя памкненні, далёкі ён быў і ад сацыялістычных ідэй. Грамадзянская пазіцыя паэта акрэслена выразна: толькі праз удасканаленне асобы шляхам адукацыі, выхавання, творчасці магчыма пабудаваць справядлівае грамадства. Выразна акрэсленая асветніцкая парадыгма культурнай дзейнасці Старога Уласа не дала магчымасці ўпісацца яго творчасці ў рэвалюцыйна-дэмакратычную плынь, таму на доўгі час спадчына самабытнага паэта была забыта.

У беларускай культуры Стары Улас займае пачэснае месца пачынальніка нацыянальнай літаратуры. Талент, мастацкая

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

арыгінальнасць Старога Уласа былі заўважаны М. Багдановічам, Я. Купалам. М. Гарэцкі ў «Гісторыі беларускай літаратуры» (1920) называе яго паэтам «з мазольнаю рукою», адзначае ўласцівы творам дух народнасці. Творчасць паэта спрыяла папулярызацыі беларускай мовы, крышталізацыі яе літаратурнай формы.

Памяць пра беларускага паэта-самавучку захоўваецца ў яго родным Валожыне. Адна з вуліц названа ў гонар Старога Уласа. На доме, які належаў яму, умацавана памятная шыльда. У 1990 г. багатая літаратурная спадчына паэта выйшла асобнай кнігай пад назвай «Год беларуса». Аднак, у Беларусі няма нават невялічкага музея, прысвечанага Старому Уласу. Пры сучасным стане дзяржаўнага фінансавання культурных праектаў гэта можа застацца марай на нявызначаны час. Захаванню гісторыка-культурнай спадчыны, яе рэпрэзентацыі ў сучаснай сацыякультурнай сітуацыі можа паспрыяць адраджэнне мецэнацкай традыцыі на беларускіх землях. Яе багатая гісторыя павінна быць асэнсавана, даследавана і ўключана ў змест нацыянальнай культуры.

---

*1.* Стары Улас. Год беларуса: Вершы. Вершав. апавяданні. Публіцыстыка / Уклад., падрыхт. тэкстаў, уступ. арт. і камент. В. Рагойшы. – Мінск : Маст. літ., 1990. – 174 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Е. Н. ФИЛАТОВА

## СВИСЛОЧЬ В СОСТАВЕ РОССИЙСКОЙ ИМПЕРИИ: ИСТОРИОГРАФИЯ

На протяжении более двух столетий сложилась, хотя и небольшая, но достаточно интересная историография, посвященная истории местечка Свислочь Волковысского уезда Гродненской губернии Российской империи. В XIX – начале XX вв. упоминания о Свислочи встречаются в отдельных работах, как, например, у П. Бобровского [3], однако наиболее полно, на мой взгляд, события отражены в очерке, написанном гродненским историком и краеведом Е. Орловским [9]. Не все в нем исторически верно применительно к более ранним векам, но основ-